ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

31 СТУДЗЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 4 (1454)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

ПУЛЬС НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ

## Аспірант у патоку інфармацыі

СЕННЯ Ў СВЕЦЕ выдаецца звыш 1 мільёна часопісных публікацый, выходзіць каля 200 тысяч навуковых і тэхнічных кніг, вучэбных дапаможнікаў, фіксуецца 500 тысяч вынаходніцтваў, абараняецца 400 тысяч дысертацый. Усё гэта вымушае сур'ёзна задумацца над тым, як сарыентавацца ва ўсё ўзрастаючым патоку інфармацыі. Аспірант знаходзіцца ў своеасаблівым становішчы. Ён стварае індывідуальную навуковую працу і адпаведна абавязаны весці персанальны адбор і вывучэнне інфармацыі па тэме свайго дысертацыйнага даследвання.

Прычым неабходна даказаць навізну выбранага напрамку і тое, што ён не дубліруе іншыя даследванні. Гэта, як правіла, патрэбна рабіць на этапе выбару тэмы даследвання. Здараецца, што тэмы даюцца кіраўнікамі без належнага папярэдняга аналізу інфармацыйных крыніц. Гэта прыводзіць да таго, што тэмы перафармуліруюцца, тэрмінова мяняюцца метады і напрамкі даследвання. У выніку аспірант губляе шмат часу і ўжо не можа ў тэрмін закончыць работу.

У нашу аспірантуру прыйшло новае папаўненне, і нашы рэкамендацыі адрасаваны ў першую чаргу да іх.

З чаго пачаць вывучэнне інфармацыйных крыніц пры выбары тэмы дысертацыйнага даследвання? Для ўсіх напрамкаў навук (прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных) з гэтай мэтай за аснову павінны брацца рэфератыўныя зборнікі навукова-даследчых работ Усесаюзнага навукова-тэхнічнага інфармацыйнага цэнтра. У гэтых зборніках (яны выходзяць з 1972 года) публікуюцца рэфераты на завершаныя ў нашай краіне навуковыя даследванні і абароненыя дысертацыі. У залежнасці ад напрамку выбранага дысертацыйнага даследвання глыбіня інфармацыйнага пошуку можа вар'іравацца ад 5 да 10 гадоў. Рэфератыўная інфармацыя, змешчаная ў дадзеных зборніках, дае дысертанту практычна поўнае ўяўленне аб усіх выкананых даследваннях, якія ў нейкай ступені знаходзяцца ў рэчышчы яго дасертацыйнай работы. Было б пажадана на кафедрах (гэта датычыцца навуковых кіраўнікоў) даручаць аспірантам рабіць на базе ўказаных крыніц аналітычны інфармацыйны агляд па тэме будучай дысертацыі. Для саіскальнікаў неабходна ўвесці дадзены агляд у пералік абавязковых дакументаў, якія суправаджаюць яго замацаванне за той ці іншай кафедрай. Дарэчы, такая практыка ўжо зарэкамендавала сябе на кафедры педагогікі, агульнага і славянскага мовазнаўства і іншых.

Акрамя ўказаных выданняў, пры падрыхтоўцы інфармацыйнага аналітычнага агляду павінны ўлічвацца і рэфератыўныя часопісы Усесаюзнага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі і Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках. На падрыхтоўку такога агляду, як правіла, затрачваецца месяц. Акрамя таго, аспірантам-грамадазнаўцам і гуманітарыям можна выкарыстоўваць і спецыяльныя тэматычныя агляды, якія перыядычна выдае Інстытут навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках. Аспірантам, якія пішуць дысертацыі па педагагічных і псіхалагічных навуках, неабходна таксама ўлічваць інфармацыйныя выданні НДІ праблем вышэйшай школы і Аддзела навуковай інфармацыі НДІ агульнай педагогікі АПН СССР.

Пры правядзенні ўказанай работы метадычную дапамогу аспірантам можа аказаць аддзел навуковай інфармацыі універсітэта (падбор крыніц, азнаямленне з правіламі работы з імі і г. д.).

У далейшай рабоце над зацверджанай тэмай аспірант павінен перыядычна знаёміцца з такімі інфармацыйнымі выданнямі, як летапісы (кніжныя, часопісныя, дысертацыі) Усесаюзнай кніжнай палаты, сігнальныя і бібліяграфічныя выданні Усесаюзнага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі, Усесаюзнага навукова-тэхнічнага інфармацыйнага цэнтра, Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках. Усе гэтыя выданні ёсць у фондах універсітэцкага аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.

Пры завяршэнні работы над тэмай аспірант сутыкаецца з цяжкасцямі ў апублікаванні рэзультатаў сваіх даследванняў. Існуючая зараз сістэма дэпаніравання навуковых рукапісаў дае магчымасць паспяхова пераадольваць гэтыя цяжкасці. Але неабходна памятаць, што дэпаніраваць работы патрэбна за 6—8 месяцаў да плануемага тэрміну абароны дысертацыі. Максімальны аб'ём дэпаніруемага рукапісу — да 48 старонак машынапіснага тэксту. Дэпаніраваныя рукапісы прыроўніваюцца да друкаваных навуковых работ.

Хочацца запрасіць маладых аспірантаў часцей наведвацца ў аддзел інфармацыі. Навуковая інфармацыя яшчэ ніколі не была перашкодай для вучонага, а заўсёды з'яўлялася самым актыўным і добрым памочнікам.

С. ПАВАЛЯЕЎ,
А. ПАДАЛКА,
супрацоўнікі аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.

Беларускі ўніверсітэт

ТЭЛЕТАЙП

«ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### Ганаровай граматай

Праўленне Савецкага фонду міру ўзнагародзіла камсамольскую арганізацыю Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна за актыўны ўдзел у дзейнасці Савецкага фонду міру і папаўненне яго добраахвотнымі ўзносамі ў інтарэсах умацавання міру, свабоды і бяспекі народаў.

А. АНАТОЛЬЕВА.

### У партыйным камітэце

адбылася нарада камісіі па кантролю за выкананнем пастановы парткома «Аб паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі універсітэта». На нараду былі запрошаны кіраўнікі грамадскіх фарміраванняў, члены партбюро падраздзяленняў — адказныя за работу грамадскіх арганізацый.

З інфармацыяй аб крытычных заўвагах, выказаных на пасяджэнні парткома, і аб мерапрыемствах па іх рэалізацыі выступіў член парткома С. Р. Мулярчык. Аб ходзе выканання прынятай пастановы дакладвалі старшыні камітэта ДТСААФ М. В. Гарлатаў і таварыства Чырвонага Крыжа Л. А. Фралоў, праўлення таварыства аматараў кнігі В. В. Германчук і савета таварыства аховы прыроды Г. М. Базыленка. На неабходнасць пошуку новых форм работы грамадскіх арганізацый, на актывізацыю іх дзейнасці звярнуў увагу намеснік сакратара парткома А. Г. Слука.

М. СЦЯПАНАЎ.

### Вынікі НДР

студэнтаў за 1984 год і работа навуковага студэнцкага савета універсітэта разгледжаны на чарговым пасяджэнні бюро камітэта камсамола. Абмеркаваны рэзультаты агляду-конкурсу на лепшы факультэт па пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў. Першае, другое і трэцяе месцы адпаведна занялі: факультэт радыёфізікі і электронікі, біяфак, фізфак.

Адзначана добрая работа навукова-даследчых саветаў філфака (старшыня В. Каўхута), хімфака (У. Марцінёнак), гістфака (С. Старкоў).

А. НІКІЦЕНКА.

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*НЕЗДАРМА КАЖУЦЬ: «Сесія — самая адказная і напружаная пара». За нейкія тры тыдні патрэбна перачытаць горы літаратуры па розных курсах, праштудзіраваць канспекты лекцый... Добра, калі ты рыхтаваўся да сесіі ў час семестра, старанна і своечасова выконваў усе заданні.*

*Для Алены Макушынскай, студэнткі 3-га курса юрыдычнага факультэта, ленінскага стыпендыята, сесія — звычайная справа. Да яе Алена рыхтуецца загадзя.*

*Але Алена не толькі вучыць, як кажуць, з раніцы да ночы. У вольны час яна любіць чытаць — у асноўным дэтэктыўную літаратуру, слухаць музыку — класічную і сучасную, займацца спортам. Не адрываецца яна і ад камсамольскага жыцця. А. Макушынская — член камітэта камсамола факультэта, адказная за сектар уліку.*

*Карацей, клопатаў шмат. Але Алена паспявае зрабіць усё ў свой час.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

24 ЛЮТАГА 1985 г.

Насустрач выбарам у Саветы

### НЕПАРУШНАЯ ЗГУРТАВАНАСЦЬ

ПРАЦЯГВАЮЦЦА пасяджэнні акружных выбарчых камісій. Камісія аднадушна вырашыла зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі па Алібегаўскай выбарчай акрузе № 26 рэктара Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.

●●●

Выбаршчыкі Алібегаўскай выбарчай акругі № 26 г. Мінска сустрэліся з кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі рэктарам Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Леанідам Іванавічам Кісялеўскім.

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ

ЗАВОЧНАЯ форма навучання ў агульнай сістэме падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй адыгрывае вялікую ролю.

Калі вы захацелі атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад асноўнай работы, мы запрашаем вас на завочную форму навучання ў БДУ імя У. І. Леніна — старэйшую навучальную ўстанову Беларусі, буйнейшы навучальны і навуковы цэнтр рэспублікі.

Завочная форма навучання — лепшая форма павышэння кваліфікацыі для тых, хто ўжо працуе па абранай спецыяльнасці, але не мае вышэйшай адукацыі.

У падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай форме навучання ў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць удзел каля 80 універсітэцкіх кафедраў, дзякуючы чаму вучэбную работу забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, у саставе якога каля 40 дактароў навук, прафесараў і каля 300 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

Вялікую дапамогу студэнтам-завочнікам у іх самастойнай рабоце аказваюць бібліятэка ўніверсітэта і вучэбна-метадычны кабінет завочнага факультэта, якія забяспечваюць студэнтаў вучэбнымі праграмамі, метадычнымі дапаможнікамі, вучэбнай літаратурай. У міжсесійны перыяд праводзяцца дні завочніка, калектыўныя і індывідуальныя кансультацыі, а таксама іншыя віды вучэбнай работы.

Студэнты-завочнікі атрымліваюць тую ж спецыяльнасць, што і выпускнікі дзённай і вячэрняй форм навучання, і працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі і культуры нашай рэспублікі. Студэнты-завочнікі карыстаюцца льготамі, якія даюць ім правы на дадатковы аплачваемы водпуск тэрмінам на 30 дзён (I—II курсы) і 40 дзён (III—IV курсы) у перыяд лабараторна-экзаменацыйных сесій, якія праводзяцца два разы ў год.

Тыя, хто хоча атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці, змогуць выбраць сабе спецыяльнасць па густу на адным з аддзяленняў завочнага факультэта. Завочнае навучанне ва ўніверсітэце вядзецца па спецыяльнасцях: філалогія, журналістыка, гісторыя, правазнаўства, геаграфія, біялогія, матэматыка.

## ЖУРНАЛІСТЫКА



ФАКУЛЬТЭТ журналістыкі быў створаны ў 1944 годзе ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Утварэнне факультэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ адно сведчанне клопатаў партыі пра наш друк. Факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна такім чынам з'явіўся роданачальнікам у падрыхтоўцы кадраў для друку ва ўніверсітэтах нашай краіны.

На факультэце ёсць завочнае аддзяленне, якое рыхтуе работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды — газет, часопісаў, радыё і тэлебачання.

За час існавання факультэт падрыхтаваў па стацыянарнай, вячэрняй і завочнай формах навучання больш як 3000 высокакваліфікаваных журналістаў. Многія яго выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі. Сёння няма практычна ніводнага раёна, дзе б не працавалі нашы выпускнікі, а многія працуюць за межамі Беларусі.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Асабліва гэта відавочна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Калі ў пяцідзесятых гадах на факультэце дзейнічала толькі адна кафедра, то зараз іх пяць: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, зарубежнай журналістыкі і літаратуры. Кафедры ўзначальваюць прафесары і дацэнты. Сёння на факультэце працуюць 39 выкладчыкаў, з іх 7 дактароў навук і 16 дацэнтаў. Сярод іх дактары навук Р. В. Булацкі, Е. Л. Бондарава, А. І. Наркевіч, І. І. Сачанка, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі, П. І. Ткачоў.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» на факультэце больш глыбока вывучаюцца грамадска-палітычныя, агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны: тэорыя марксізму-ленінізму, гісторыя КПСС, унутраная і знешняя палітыка партыі і ўрада, савецкае права, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, метады ідэалагічнай работы, прыкладная сацыялогія. Па ўніверсітэцкай праграме студэнты вывучаюць беларускую, рускую, замежную мову і літаратуру, практычную стылістыку і рэдагаванне, гісторыю рускай, партыйна-савецкай, замежнай камуністычнай і рабочай журналістыкі, тэорыю і практыку тэлебачання і радыёвяшчання, тэхніку газетнай справы, журналісцкае майстэрства.

Факультэт журналістыкі рыхтуе кадры не толькі для рэспублікі, але і для больш чым 48 краін, якія развіваюцца.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў па эканамічных пытаннях. Таму ўводзяцца новыя курсы па вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, аналізу гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграме ідэйнага выхавання і інш. Студэнты факультэта выпускаюць сваю вучэбную газету «Журналіст» і альманах «Творчасць журналіста», актыўна ўдзельнічаюць у выпуску шматтыражкі «Беларускі універсітэт», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства. Шмат цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі, рэжысёрамі.

## МАТЭМАТЫКА




У 1985 ГОДЗЕ адкрываецца набор на аддзяленне матэматыкі завочнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Аддзяленне будзе рыхтаваць кваліфікаваныя кадры для работы, звязанай з выкарыстаннем матэматыкі і ЭВМ у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах, заводскіх лабараторыях, а таксама выкладчыкаў сярэдніх школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У адпаведнасці з вучэбным планам выпускнікі аддзялення матэматыкі атрымліваюць фундаментальныя веды ў самых розных галінах тэарэтычнай і прыкладной матэматыкі, вывучаць праграміраванне і метады вылічэнняў, авалодаюць неабходнымі навыкамі работы на вылічальных машынах. Студэнты-завочнікі, якія будуць працаваць выкладчыкамі ў школах і іншых навучальных установах, вывучаць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага цыкла і методыку выкладання матэматыкі. Дадатковая спецыялізацыя студэнтаў-завочнікаў, якія будуць працаваць у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах, заводскіх лабараторыях, будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з профілем іх работы на IV, V і VI курсах за кошт дысцыплін спецыялізацый. Навучанне на аддзяленні матэматыкі заканчваецца здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму і абаронай дыпломнай работы.

Вучэбны працэс на аддзяленні матэматыкі будуць ажыццяўляць сем кафедраў: вышэйшай алгебры; геаметрыі; тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі; тэорыі функцый; функцыянальнага аналізу; дыферэнцыяльных ураўненняў; ураўненняў матэматычнай фізікі; лічбавых метадаў і праграміравання.

## БІЯЛОГІЯ



БІЯЛАГІЧНЫ факультэт з'яўляецца старэйшым і буйнейшым цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы біёлагаў. Па гэтай спецыяльнасці падрыхтоўка вядзецца на дзённым і завочным аддзяленнях. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «біёлаг, выкладчык біялогіі і хіміі».

Агульнанавуковая падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца пры дапамозе вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, замежнай мовы, вышэйшай матэматыкі, фізікі, неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, варыяцыйнай статыстыкі. Студэнты вывучаюць таксама педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання біялогіі і хіміі, праходзяць педагагічную практыку ў сярэдняй школе.

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем уводзін у спецыяльнасць, заалогіі беспазваночных і пазваночных, анатоміі, марфалогіі і сістэматыкі раслін, мікрабіялогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, біяфізікі, гісталогіі, генетыкі, дарвінізму.

На гэтай аснове вядзецца спецыялізацыя студэнтаў па адной з сучасных галін біялогіі: батаніцы, заалогіі. Студэнты праходзяць вытворчую практыку ў лабараторыях кафедраў, экспедыцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР і іншых навуковых установах, на прамысловых прадпрыемствах.

На факультэце працуе сем кафедраў, комплексная праблемная лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, лабараторыя фотасінтэзу (пры кафедры фізіялогіі раслін), біялагічная станцыя на возеры Нарач, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца», батанічны сад. Вучэбны працэс забяспечваюць 28 вучэбных і навукова-даследчых лабараторый і кабінетаў.

Вучэбны працэс на факультэце вядуць больш за 40 дактароў і кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі біялагічных інстытутаў Акадэміі навук БССР.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ВНУ, ва ўстановы сістэмы Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды, дзяржаўныя запаведнікі, на прамысловыя прадпрыемствы, а студэнты, якія выявілі здольнасці да навукова-даследчай работы,— ва ўстановы Акадэміі навук БССР, а таксама ў навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства аховы здароўя.

## ПРАВАЗНАЎСТВА



ПАДРЫХТОЎКА спецыялістаў-правазнаўцаў ажыццяўляецца па трох напрамках: дзяржаўна-прававому, гаспадарча-прававому і судзебна-пракурорска-следчаму.

Выпускнікі аддзялення працуюць у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, у міністэрствах, ведамствах, вытворчых аб'яднаннях, на прадпрыемствах, ва ўстановах, у органах юстыцыі, пракуратуры, міліцыі.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць юрыстамі ў народнай гаспадарцы ў якасці начальнікаў аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама юрысконсультамі.

Судзебна-пракурорска-следчая. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, натарыусаў, работнікаў апарату абласных аддзелаў юстыцыі, органаў Міністэрства ўнутраных спраў.

Лепшыя студэнты — выпускнікі факультэта — маюць магчымасць паступіць у аспірантуру. Значная частка прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта — былыя выпускнікі.

Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх законаў Беларускай ССР. Яны былі ўключаны ў рабочыя групы па падрыхтоўцы крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянскага, грамадзянска-працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў. Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў прыцягваюцца студэнты. У іх ёсць магчымасць працаваць і па тэарэтычных праблемах дзяржавы і права.

На кафедрах факультэта працуюць навуковыя студэнцкія гурткі.

У працэсе вучобы студэнты праходзяць і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца вучоба абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## ГЕАГРАФІЯ



ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў. Таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

На факультэце два аддзяленні: дзённае і завочнае. У саставе факультэта сем кафедраў і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая навукова-даследчая лабараторыя возеразнаўства.

Студэнты завочнага факультэта атрымліваюць спецыяльнасці: фізічная ці эканамічная геаграфія. Студэнты-завочнікі, таксама як і студэнты дзённага аддзялення, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных навук. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і іншыя.

Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геалогію і карысныя выкапні СССР, геаграфію чацвярцічных адкладанняў, ландшафтазнаўства, праблемы фізічнай геаграфіі СССР, раяніраванне і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюць для эканоміка-географаў,— эканамічнае раяніраванне, статыстыка, геаграфія транспарту, школьны турызм і краязнаўства, эканамічнае раяніраванне.

Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна» — месца праходжання ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрнатаў, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыі. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебу, вызначаюць форму і памеры ўзвышшаў, нізін, іх прыроду, вядуць назіранні за прыродай.

Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў звязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі пішуцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты дзённай формы навучання, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, падаюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс.

## ФІЛАЛОГІЯ



ХТО ЛЮБІЦЬ родную мову і літаратуру, хто жадае быць выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, той запрашаецца на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры.

Адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў вучобе і выхаванні творчай моладзі. Яны звязаны з навукова-педагагічнай работай на факультэце вядомых вучоных і пісьменнікаў — народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа, акадэміка АН БССР І. І. Замоціна, прафесараў Е. І. Барычэўскага, А. Н. Вазнясенскага, М. Н. Піатуховіча, П. А. Бузука і іншых, якія шмат зрабілі для развіцця лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі БССР, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай адукацыі, навуковых і культурных устаноў рэспублікі. Гэтыя традыцыі захоўвае і памнажае прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, у саставе якога сёння налічваецца 125 чалавек. Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР: прафесары Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, С. Х. Александровіч, П. І. Ткачоў, А. Я. Супрун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, І. П. Кахно, А. Б. Плотнікаў, дацэнты Д. Я. Бугаёў, В. П. Рагойша, М. Б. Яфімава і іншыя.

Завочную форму навучання абслугоўвае 7 кафедраў: беларускай мовы, беларускай літаратуры, рускай мовы, рускай класічнай літаратуры, рускай савецкай літаратуры, агульнага і славянскага мовазнаўства, замежнай літаратуры.

Вучэбна-выхаваўчы працэс вядуць тыя ж выкладчыкі, якія працуюць на стацыянары. Яны дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць устойлівыя і трывалыя веды па вывучаемых прадметах, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты-завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана і ў тым жа аб'ёме, што і студэнты стацыянара. Вучэбны працэс на завочным факультэце адрозніваецца ад стацыянарнага тым, што ён дзеліцца на дзве вучэбна-экзаменацыйныя сесіі (зімовую і летнюю) і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў-завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны валодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай мовах, гісторыі беларускай і рускай літаратур, методыцы іх выкладання, стараславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуры, агульнаму мовазнаўству і інш.

Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія фарміруюць у студэнта марксісцка-ленінскі светапогляд і выхоўваюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка-ленінская філасофія і г.д. Акрамя гэтага, студэнты вывучаюць лацінскую мову, а таксама адну з замежных (англійскую, нямецкую, іспанскую ці французскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна-педагагічную практыку.

Студэнтам-завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта напісана шмат падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў.

Выкладчыкі даюць рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялаў, як выканаць кантрольныя і курсавыя работы, як рыхтавацца да залікаў і экзаменаў.

Кожны месяц праводзяцца дні завочніка, у час якіх можна атрымаць кваліфікаваную кансультацыю, датэрмінова здаць залік ці экзамен, сустрэцца з кіраўніком курсавой ці дыпломнай работы.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што выхаванцы завочнай формы навучання з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія з гонарам нясуць высокае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

## ГІСТОРЫЯ



ГІСТАРЫЧНЫ факультэт быў адкрыты ў верасні 1934 года. Ён рыхтуе гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства. Выпускнікі факультэта працуюць настаўнікамі, выкладчыкамі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў, супрацоўнікамі музеяў, архіваў і экскурсійных бюро. Многія з іх актыўна працуюць у саставе партыйных і камсамольскіх органаў.

Студэнт-гісторык атрымлівае шырокую гуманітарную адукацыю і глыбокую ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, а таксама фундаментальныя веды па сацыяльных дысцыплінах.

На факультэце ўдзяляецца вялікая ўвага рабоце са студэнтамі-завочнікамі. Для іх чытаюць лекцыі такія вядомыя вучоныя, як прафесары У. Р. Івашын, У. С. Багданаў, Л. М. Шнерсон, Р. М. Трухноў, В. В. Чапко, Д. Б. Мельцар, В. С. Сцёпін, А. С. Кляўчэня і іншыя. Многія з іх з'яўляюцца выпускнікамі гістарычнага факультэта.

Многія былыя студэнты гістфака займаюць зараз высокія і адказныя пасады. Ёсць сярод выпускнікоў дырэктары НДІ, рэктары ВНУ, дэканы, загадчыкі кафедраў грамадскіх навук, адказныя работнікі партыйнага і савецкага апарату.

Студэнты-гісторыкі маюць магчымасць спецыялізавацца па гісторыі СССР, гісторыі БССР, гісторыі КПСС, усеагульнай гісторыі, археалогіі і этнаграфіі.

Кафедры факультэта аказваюць дапамогу настаўнікам сярэдніх школ рэспублікі ў паляпшэнні выкладання гісторыі, выдаюць дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі для школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На факультэце ёсць музей, які складаецца з аддзелаў археалогіі, этнаграфіі, старажытнага Усходу, антычнага мастацтва, нумізматыкі і манетных кладаў. У 1977 годзе створаны музей універсітэта.

Факультэт падтрымлівае трывалыя сувязі з Сафійскім (НРБ) і Йенскім (ГДР) універсітэтамі. Кожны год студэнты факультэта праходзяць практыку ў ГДР, знаёмяцца з гісторыяй і культурай гэтай братняй краіны. У сваю чаргу студэнты з Балгарыі, ГДР, Польшчы — частыя госці на факультэце.

## ЛАЎРЭАТЫ ПРЭМІІ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

*ВЯЛІКАЯ навукова-даследчая работа вядзецца ў сценах універсітэта. Актыўны ўдзел у ёй прымаюць як супрацоўнікі, так і студэнты.*

*У 1973 годзе пад кіраўніцтвам прафесара кафедры ядзернай фізікі У. Р. Барышэўскага пачалі навукова-даследчую работу ў галіне ядзернай оптыкі Ірына Якаўлеўна Дубоўская, тады выпускніца кафедры ядзернай фізікі, і Віктар Васільевіч Ціхаміраў, студэнт кафедры тэарэтычнай фізікі.*

*Сур'ёзная, мэтанакіраваная работа пад вопытным кіраўніцтвам дала станоўчыя вынікі. У мінулым годзе дацэнт кафедры ядзернай фізікі І. Я. Дубоўская і малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі ядзернай оптыкі В. В. Ціхаміраў за работу «Ядзерная оптыка высокіх энергій» атрымалі прэмію Ленінскага камсамола Беларусі.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*







ФІЗКУЛЬТУРА **СПОРТ** ФІЗКУЛЬТУРА

**Лічаць, што поспех вызначаецца па канчатковаму выніку працы. І па ім мяркуюць, як працуе ўвесь калектыў. Але ёсць і другая мерка. Гэта — адносіны да справы. Канчатковы вынік не заўсёды адлюстроўвае сапраўднае становішча: у адных рэзерваў бывае больш, у другіх — менш. Але калі чалавек пастаянна з душой адносіцца да абавязкаў, то добрых рэзультатаў ён абавязкова дасягне.**

# ЯК АДНЯСЕШСЯ ДА СПРАВЫ

ПАГЛЯДЗІЦЕ, хто задае тон у спартыўным жыцці універсітэта — юрыдычны, фізічны факультэты, факультэт радыёфізікі і электронікі. Тут зацікаўлены, каб спартыўна-масавая работа заўсёды была на высокім узроўні. І адкрыта скажам, што на біялагічным, філалагічным, а ў апошні час і на гістарычным факультэтах мала звяртаюць увагі на развіццё фізкультуры і спорту. Іменна таму першыя вышэйназваныя факультэты займаюць заўсёды высокія месцы, а апошнія — стаяць у табліцы ў самым канцы.

У мінулым годзе «Беларускі універсітэт» не раз выказваў крытычныя заўвагі многім факультэтам, газета крытыкавала некаторыя спортбюро і камітэты камсамола факультэтаў. Патрэбна прызнаць, што не ўсюды становішча палепшылася.

Шэраг крытычных заўваг адрасавалася гістарычнаму факультэту. І не дзіўна: гістфак заняў адно з апошніх месц як у спартакіядзе, так і ў аглядзе-конкурсе. Амаль тры дзесяцігоддзі ён быў лідэрам універсітэцкага спорту, а вось ужо два гады ён ходзіць у адстаючых. Тут самы нізкі працэнт удзелу студэнтаў у спаборніцтвах, а ў раздзеле «Прапаганда фізкультуры і спорту» факультэт набраў мізэрную колькасць ачкоў. Справа, напэўна, у тым, што да пытанняў фізкультуры і спорту тут пачалі адносіцца абыякава. У мінулым навучальным годзе безадказна падышлі да выбару саставу спортбюро, і таму апошняе доўга бяздзейнічала. Не адчуваецца падтрымкі і з боку камітэта камсамола. Восенню, напрыклад, першы курс амаль увесь не з'явіўся на кубак першых курсаў па бегу, былі няўкі на спаборніцтвы па баскетболу і валейболу. А сакратар камітэта камсамола А. Крыштан лічыць немэтазгодным «умешвацца ў справы спортбюро».

Цяперашні старшыня спортбюро Вячаслаў Ігнацюк душою хварэе за справу. І верыцца, што гістфак палепшыць становішча, але ўпушчанае вельмі цяжка наганяць.

Не дасягае вышынь у апошнія гады і біялагічны факультэт. Дзесятае месца ў спартакіядзе, апошняе ў аглядзе-конкурсе, апошняе па падрыхтоўцы значкістаў ГПА, адно з апошніх па падрыхтоўцы спартсменаў-разраднікаў. За год тут падрыхтаваны адзін кандыдат у майстры спорту, адзін спартсмен першага разраду і ўсяго трыццаць дзевяць масавых разрадаў. Цяжка сказаць, каму адрасаваць крытыку, бо спортбюро і камітэт камсамола, здаецца, перасталі займацца спартыўна-масавай работай.

У апошні час паўстала пытанне аб рабоце спортбюро і на механіка-матэматычным факультэце. Члены спортбюро ці не ведаюць сваіх абавязкаў, ці не хочуць працаваць, У іх «пасіве» — ніводнага праведзенага спаборніцтва на факультэце, ніводнай выпушчанай насценгазеты, пачала «культгаць» і арганізацыя зборных каманд факультэта.

Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту факультэта прыкладной матэматыкі А. М. Міхнавец некалькі гадоў скардзіўся на дрэнную работу спортбюро. Атрымлівалася так: у спартакіядзе, дзе ўсю работу на сябе ўзвальваў выкладчык, ФПМ уваходзіў у прызёры, а ў аглядзе-конкурсе, які быў на сумленні спортбюро, факультэт нязменна быў у ліку адстаючых. Сёлета старшынёй выбраны трэцякурснік Д. Бярозкін. Ён змог наладзіць работу, і ў першым семестры на факультэце прайшло некалькі цікавых спаборніцтваў, выпускаліся насценныя газеты.

Дэканаты, партыйныя бюро, камітэты камсамола факультэтаў павінны ўвесь час звяртаць увагу на работу спортбюро. І перш за ўсё павінны падбіраць у іх састаў дзелавых, умеючых і жадаючых працаваць людзей. Добра ідуць справы ў гэтых адносінах на юрыдычным, фізічным, геаграфічным факультэтах, факультэце радыёфізікі і электронікі. Тут састаў спортбюро застаецца амаль нязменным на працягу многіх гадоў. Старшынь падбіраюць загадзя. Так, тры гады ўзначальвалі спортбюро М. Байкоўскі (юрфак), А. Кулінка (факультэт радыёфізікі і электронікі), А. Вялікаселец (геафак). Цяпер яны займаюцца на пятым курсе. На змену ім прыйшлі студэнты, якія раней актыўна працавалі ў саставе спортбюро. Гэта В. Белавусаў, К. Журак, А. Карлоўскі. Яны не з'яўляюцца навічкамі, добра ведаюць свае абавязкі.

На фізічным факультэце створаны савет фізкультуры, які ўзначаліў не студэнт, а супрацоўнік. М. Сянюк мае памочнікаў як з ліку студэнтаў, так і супрацоўнікаў. Ці не варта вопыт фізікаў распаўсюдзіць на іншых факультэтах?

Адносіны да справы вызначаюцца тым, як працуе чалавек. Дзелавыя, шчырыя адносіны павінны характарызаваць кожнага члена спортбюро, членаў камітэтаў камсамола, адказных за развіццё фізкультуры і спорту на факультэтах. І яшчэ патрэбна падтрымка з боку дэканатаў і партыйных бюро факультэтаў.

**У. АБРАМОВІЧ,**
наш кар.

# «НЕ ЗДАВАЦЦА!»

ДЗВЕРЫ аўдыторыі, у якой праходзілі універсітэцкія спаборніцтвы па шахматах, расчыніліся, і насустрач мне выйшла дзяўчына, па шчаслівай усмешцы якой я здагадалася, што перамога за ёй... А потым было знаёмства. І нягледзячы на тое, што сустрэліся мы з Вольгай Ламакінай, кандыдатам у майстры спорту па шахматах, упершыню размова была шчырай і сардэчнай.

— Вольга, чаму іменна гэты від спорту ты выбрала?

**— Першае знаёмства з шахматнай дошкай адбылося яшчэ ў дзевяцігадовым узросце, калі нас, трэцякласнікаў, вырашылі навучыць гэтай складанай гульні нашы шэфы — піянеры. Потым я зразумела, што шахматы — мой любімы від спорту. Мне падабалася падоўгу сядзець за шахматнай дошкай, прыдумваць хады і камбінацыі. Яны былі простымі, але іменна з іх пачаліся мае першыя крокі ў вялікі спорт.**

— Бясспрэчна, мінулы год стаў для цябе самым знамянальным?

**— Гэта не зусім так. Самыя шчаслівыя ўспаміны звязаны з 1981-м годам. Па-першае, я ўдзельнічала ў саставе каманды школьнікаў Беларусі на Усесаюзных спаборніцтвах. І другая значная падзея: мне прысвоілі ганаровае званне кандыдата ў майстры спорту.**

**Мінулагоднія падзеі таксама прыемныя. Я перамагла на чэмпіянаце БССР сярод моладзі. Турнір быў напружаным: цэлая група шахматыстаў прэтэндавала на першае месца.**

— Ты — студэнтка механіка-матэматычнага факультэта. Ці ёсць якая непасрэдная сувязь паміж тваёй вучэбнай і спартыўнай дзейнасцю?

**— Часта ў мяне пытаюць, ці не перашкаджаюць шахматы вучобе, бо вольнага часу застаецца небагата. Але я на гэта пытанне магу ўпэўнена адказаць: не толькі не перашкаджаюць, але і дапамагаюць. Іменна шахматная гульня навучыла мяне лагічна думаць, разважаць, аналізаваць.**

— Ва універсітэце займаюцца дзве чэмпіёнкі рэспублікі. Студэнтка журфака Эльміра Харавец, якая валодае чэмпіёнскім тытулам сярод дарослых, і ты. Аматары шахмат чакалі вашай сустрэчы на першынстве універсітэта...

**— Але яна не адбылася. Эльміра гуляла на першай мужчынскай дошцы і набірала ачкі, а я ў мэтах каманднай барацьбы выступіла на чацвёртай мужчынскай. Праўда, сапернікі не былі самымі моцнымі, але давялося крыху пазнаць мужчынскую гульню, гульню хуткую, атакуючую.**

— Я ведаю, што многія юнакі і дзяўчаты любяць шахматы, але пры першых няўдачах апускаюць рукі. Што б магла ім параіць?

**— Быць больш упэўненымі ва ўласных сілах і не пасаваць перад цяжкасцямі. Не заўсёды ўсё гладка было і ў мяне, але дэвіз «Не здавацца!» дапамагаў пераадольваць адчай і дасягаць пастаўленай мэты. Больш настойлівасці, сябры!**

**І. КАЖЭЎНІКАВА.**

***ДЗЕНЬ ДОБРЫ, КАНІКУЛЫ!***

# І карысна, і цікава

**Экзаменатар бярэ вашу залікоўку, ставіць у яе апошнюю адзнаку, і вы, з палёгкай уздыхнуўшы, выходзіце з аўдыторыі. Усё! Шматлікія турботы і хваляванні скончыліся. Сесія, такая цяжкая сесія нарэшце здадзена, а зараз...**

**Так, а што ж зараз? Зразумела, канікулы. Але ці вырашылі вы, як правесці свой сумленна заслужаны адпачынак?**

**Аб гэтым мы і пагутарылі са старшынёй прафбюро ФПМ Зояй Калтунчык і старшынёй спартыўна-аздараўленчай камісіі Наташай Малахавай.**

— Зоя, скажы, калі ласка, ці паклапацілася прафбюро факультэта аб арганізацыі адпачынку студэнтаў у час зімовых канікулаў?

**— На нашым факультэце вучыцца каля 1500 студэнтаў, што стварае накаторыя цяжкасці. Але з упэўненасцю можна сказаць, што прафбюро зрабіла ўсё, каб студэнты, здаўшы сесію, маглі добра адпачыць.**

— Што канкрэтна прафбюро прапануе студэнтам?

**— У асноўным гэта адпачынак у санаторыях, дамах адпачынку і на турыстычных базах. Заезды ў санаторыі — кожны месяц, у тым ліку і ў час канікулаў. Студэнты маюць магчымасць правесці канікулы ў доме адпачынку «Пухавічы» з 4 па 15 лютага і на турбазе «Нарач» з 29 студзеня па 9 лютага, а таксама адправіцца ў шасцідзённае падарожжа на турыстычным поездзе «Мінск — Харкаў — Валгаград — Палтава — Мінск». А тым, хто застанецца ў Мінску, мы прапануем таксама наведаць філармонію, тэатры оперы і балета, лялек...**

— Наташа, а зараз пытанне да цябе: як паклапаціліся аб тых, хто сябруе са спортам?

**— Зразумела, што зімой самы распаўсюджаны від спорту — лыжы (сёлетняя зіма парадавала лыжнікаў добрым надвор'ем). У нас ужо стала традыцыяй кожны год праводзіць зорныя паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Акрамя таго, студэнты змогуць карыстацца дзвюма лыжнымі базамі.**

— І апошняе пытанне: як вы самі мяркуеце правесці зімовыя канікулы?

**— У нас ёсць добрыя сувязі з Кіеўскім універсітэтам, з якім мы вядзём перапіску. Наша прафбюро вырашыла арганізаваць паездку ў сталіцу Украіны, каб пазнаёміцца з гэтым старажытным горадам, Кіеўскім універсітэтам, а таксама пераняць вопыт работы прафсаюзнага камітэта. Спадзяёмся, што гэта будзе для нас лепшым адпачынкам.**

Інтэрв'ю правёў
**А. ШАШКОЎ,**
студэнт факультэта журналістыкі.



*Каля лясной старожкі.*
*Фотаэцюд А. ВАЛОШКІНА.*

# ЗАДУМАНАЕ ЗБУДЗЕЦЦА

**Студэнты трэцяй групы трэцяга курса фізічнага факультэта здавалі апошні экзамен зімовай сесіі. І зусім натуральна, што бурна абмяркоўвалі планы на канікулы. У кожнага свае задумы: адзін хоча пабываць у вёсцы, другі — наведаць сябра ў іншым горадзе, трэці — пайсці ў падарожжа, аб якім марыў, магчыма, з першага курса. Мы папрасілі трэцякурснікаў расказаць аб тым, як яны мяркуюць правесці канікулы.**

Лена Шыран адправіцца ў турыстычны паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

**— На гэты раз на лыжах нам давядзецца прайсці шмат кіламетраў,— гаворыць Лена.— Наш маршрут праляжа цераз Нясвіж, Мір, Налібоцкую пушчу. Думаем сабраць матэрыял аб гісторыі гэтага краю у гады Вялікай Айчыннай. Вялікае месца будзе адведзена і працоўным здзяйсненням людзей у сённяшнія дні.**

Падарожжу на турыстычным поездзе вырашылі прысвяціць канікулы В. Янушкевіч і С. Тончыкаў.

**— Хочацца пазнаёміцца з гарадамі нашай краіны, з іх мінулым і сучасным, з людзьмі,— адзначае Віктар.— А зрабіць гэта лепш за ўсё ў час канікулаў. Мы наведаем сталіцу Украіны Кіеў, гарады Данецк, Харкаў, Львоў, Валгаград. Думаецца, што канікулы мы правядзём з карысцю для сябе.**

Многія студэнты змогуць пабываць у час канікулаў у Ленінградзе, Пскове, пазнаёміцца з гісторыяй і культурай гэтых гарадоў, з архітэктурнымі помнікамі.

А спартсменаў чакаюць новыя спаборніцтвы. Некалькі студэнтаў групы — члены зборных універсітэта. Яны прымуць удзел у турнірах па валейболу, баскетболу, лёгкай атлетыцы, у лыжных гонках. Будзем спадзявацца, што ўсё задуманае збудзецца: студэнты цудоўна адпачнуць, паправяць сваё здароўе, набяруцца новых сіл.

**С. БАЛЦЭВІЧ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2211. АТ 13055.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ